

М.М. НОВІКАЎ

# *МЕЖЫ ВЫТВОРЧАЙ СФЕРЫ ДЗЕЙНАСЦІ РЫНАЧНАЙ ЭКАНОМІКІ*

Пастановай ад 27 жніўня 1993 г. за № 523 Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў праграму пераходу краіны на новую сістэму ўліку і статыстыкі, якая адпавядае сусветнай практыцы. Пайсці на гэта прымусілі рыначныя адносіны, якія ўсё шырэй укараняюцца ў нашу эканоміку і патрабуюць карэнных змен і ў інфармацыйнай статыстычнай сістэме. Наваўвядзенне выклікала ў супрацоўнікаў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў рэспублікі неабходнасць набыцця дадатковых ведаў і вопыту.

Адзначым, што адна з асноватворчых асаблівасцей статыстычнай сістэмы рыначнай эканомікі — новы падыход да вызначэння межаў вытворчай сферы дзейнасці.

У сістэме рыначных адносін праводзіцца размежаванне паняццяў "эканамічная дзейнасць" і "вытворчая дзейнасць". Эканамічная дзейнасць з'яўляецца больш шырокім паняццем. Яна ўвасабляе ў сабе ўсе віды дзейнасці адносна вытворчасці тавараў і паслуг, прызначаных для рынка, якія ўключаюць і калектыўныя паслугі, што фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту.

Тавары як эканамічная катэгорыя складаюць прадметы аб'ектаў уласнасці гаспадарчага суб'екта, якія маюць попыт з боку другіх суб'ектаў.

Адметнымі асаблівасцямі паслуг з'яўляюцца:

іх выкананне па заказу;

момант завяршэння вытворчасці, які сумяшчаецца з пачаткам іх спажывання.

У працэсе выканання паслуг забяспечваюцца:

паляпшэнне спажывецкіх якасцей тавару;

магчымасць карыстання транспартам;

вытворчасць рамонтных работ;

паляпшэнне здароўя;

наданне знешняга выгляду таварам;

набыццё прафесійных навыкаў, майстэрства, ведаў;

забеспячэнне інфармацыяй, аказанне кансультацый, правядзенне забаўляльных мерапрыемстваў і г. д.

Магчымасць карыстання паслугамі можа быць забяспечана таксама ў выглядзе крэдытаў, займаў або захавання бяспекі.

Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што прадастаўленне паслугі ўвасабляецца ў таварах, матэрыяльных ці фінансавых актывах гаспадарчага суб'екта або ў стане фізічнай асобы.

Паслугі могуць аказвацца як адной, так і групе асоб. У апошнім выпадку яны набываюць форму калектыўных паслуг.

Патрэбна распазнаваць паслугі, якія:

аплачваюцца індывідуальна кожным членам калектыва, якому гэтыя паслугі аказваюцца;

фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту.

Міхаіл Міхайлавіч Новікаў, кандыдат эканамічных навук, дацэнт.

Эканамічная дзейнасць абумоўлена арганізацыяй спецыялізацыі вытворцаў як асноўнай умовай росту эфектыўнасці вытворчасці тавараў і паслуг. Да сферы эканамічнай дзейнасці не належаць толькі тыя яе віды, якія не могуць быць перадаручаны другім асобам, напрыклад заняткі спортам, прыгатаванне ежы, сон.

У параўнанні з эканамічнай дзейнасцю вытворчая сфера вызначаецца як больш вузкая. Яна адрозніваецца ад эканамічнай на велічыню неаплачаных асабістых паслуг, якія выконваюцца хатнімі гаспадаркамі для ўласнага спажывання. Да такіх паслуг належаць прыгатаванне ежы, выхаванне дзяцей, догляд хворых, старых і дзяцей, прыбіранне і рамонт жылля, рамонт і абслугоўванне хатняга скарбу, транспартных сродкаў і інвентару, якія належаць асабістым гаспадаркам, а таксама перавозка членаў дамашніх гаспадарак і хатняй маёмасці. Пры гэтым трэба падкрэсліць, што з гаспадарчай сферы дзейнасці не выключаецца выраб тавараў хатнімі гаспадаркамі для асабістага карыстання. Гэта датычыць толькі паслуг.

Такі метадалагічны падыход да вызначэння вытворчай сферы дзейнасці абумоўлены шэрагам прычын. З аднаго боку, не ўзнікае ніякага сумнення накшталт вытворчага характару дзейнасці хатніх гаспадарак адносна вытворчасці асабістых паслуг. Больш таго, хатнія гаспадаркі ўтрымліваюць наёмную прыслугу, рэпетытараў, нянек, шафёраў і г. д. Лічыцца таксама, што ў шэрагу краін вытворчасць асабістых паслуг істотна ўплывае на ўзровень народнага дабрабыту. Тым не менш гэтыя доказы не бяруцца ў разлік. Такая акалічнасць тлумачыцца наступным.

Па-першае, сумяшчэнне часу завяршэння вытворчасці паслугі з пачаткам спажывання прыдае ёй аўтаномны характар. Вось чаму вытворчасць паслуг асабістага спажывання слаба звязана з астатняй эканомікай. З такой нагоды становіцца немэтазгодным уводзіць умоўна вылічаныя паказчыкі паслуг з наступнай іх праводкай па ўсіх іншых узаемаўзгодненых рахунках сістэмы. Другая справа вытворчасць тавараў. Хатняя гаспадарка, якая выпрабляе прадукт, напрыклад збожжа альбо бульбу, яшчэ не прымае рашэння аб памеры яго ўласнага спажывання і той яго часткі, якая прызначаецца для рынка.

Па-другое, з прычыны таго, што паслугі спажываюцца ва ўласнай гаспадарцы, не маючы выхаду на рынкі, у рэальным жыцці не існуе і саміх рынкаў такіх паслуг, дзе можна было б вызначыць цэны на гэтыя паслугі. Таму вартасныя паказчыкі хатніх паслуг цяжка паддаюцца ўліку.

Па-трэцяе, выдаткі вытворчасці ўласных паслуг нельга атаясамліваць з выдаткамі на выраб аналагічных паслуг для рынка спецыялізаванымі вытворцамі.

Па-чацвёртае, умоўны падлік аб'ёма паслуг для ўласнага спажывання запатрабаваў бы арганізацыі падліку колькасці насельніцтва, якое занята іх вытворчасцю. Аднак гэта насельніцтва нельга лічыць актыўным у эканамічным сэнсе слова, параўноўваючы яго з працоўнымі рэсурсамі ў другіх сектарах эканомікі. Пры такім падыходзе давялося б адказацца ад паняццяў занятасці і беспрацоўя наогул.

Паслугі, якія выпрабляюцца для ўласнага спажывання хатнімі гаспадаркамі, уключаюцца ў склад аб'ёма вытворчасці. Такім чынам, жыллёвыя паслугі ўваходзяць у валавы ўнутраны прадукт. Аргументамі на карысць такога падыходу з'яўляюцца наступныя палажэнні.

Па-першае, жыллёвыя будынкі, якія займаюць хатнія гаспадаркі, улічваюцца ў складзе асноўных фондаў. Адсюль вынікае мэтазгоднасць умоўнай ацэнкі атрыманых ад іх выкарыстання даходаў.

Па-другое, значная частка жылля здаецца ў наём, што з'яўляецца прычынай для стварэння магутных рынкаў для такога роду паслуг. У выніку гэтага жыллёвыя паслугі набываюць усе характарыстыкі тавару, што мае рынак збыту, і таму яны ўлічваюцца як тавар, які выпрабляецца

хатнімі гаспадаркамі для ўласнага спажывання. Умоўная велічыня даходу ад выкарыстання жыллёвых будынкаў, што належаць гаспадаркам, ацэньваецца на ўзроўні арэнднай платы за жыллё, якое здаецца ў наём.

У частцы тавараў, што вырабляюцца хатнімі гаспадаркамі, не існуе выразных межаў іх падраздзялення па відах выкарыстання: якая частка тавараў выраблена для рынка і якая — для ўласнага спажывання. На гэтай падставе вядзецца агульны ўлік вытворчасці тавараў. З усяго спісу тавараў, якія вырабляюцца хатнімі гаспадаркамі, у якасці прыклада можна прывесці:

1) вытворчасць сельскагаспадарчых прадуктаў і іх захаванне, у тым ліку збор дароў прыроды, нарыхтоўка дроў, паляванне і рыбалоўства;

2) вытворчасць сыравінных тавараў: нарыхтоўка торфу, смалыжывіцы і г. д.;

3) перапрацоўка сельскагаспадарчых прадуктаў: памол збожжа, кансерваванне агародніны, вытворчасць віна, забой жывёлы і перапрацоўка прадукцыі жывёлагадоўлі;

4) іншыя віды перапрацоўкі: пашыў вопраткі, вырабы абутку, мэблі і інш.

Рамонт тавараў працяглага карыстання і дробная папраўка ўласнага жылля не адносяцца да вытворчай сферы дзейнасці. Выдаткаваныя пры гэтым матэрыялы ўлічваюцца ў складзе расходаў на канчатковае спажыванне.

Выдаткі на капітальны рамонт уласных жыллёвых памяшканняў, якія ўключаюць спажыванне матэрыялаў, разглядаюцца ў складзе вытворчай дзейнасці і адносяцца да прамежкавых затрат на аказанне жыллёвых паслуг. Пашырэнне жыллёвых памяшканняў улічваецца на рахунку капіталаўтварэння (накапленне капіталу).

Для задавальнення патрабаванняў сям'і хатнія гаспадаркі набываюць рэчы працяглага карыстання, харчовыя тавары, а таксама робяць запасы. Іх перапрацоўка, напрыклад прыгатаванне ежы, захаванне адносяцца да асабістых паслуг, прызначаных для ўласнага спажывання і з гэтай нагоды не ўключаюцца ў вытворчую сферу дзейнасці. Выкарыстанне тавараў працяглага спажывання, напрыклад аўтамабіляў , у мэтах задавальнення патрабаванняў членаў хатніх гаспадарак разглядаецца як канчатковае спажыванне і ў гэтай сваёй якасці не павінна вызначацца кампанентам вытворчасці або яго працягам.

Захаванне сельскагаспадарчай прадукцыі разглядаецца як працяг працэсу яе вытворчасці. Водазабеспячэнне хатніх гаспадарак з'яўляецца адным з відаў дзейнасці па вырабу тавараў (па прыкладу здабычы карысных выкапняў), які ўключае іх транспарціроўку да месца спажывання. На гэтай падставе такія віды дзейнасці належаць да сферы вытворчасці.

Сістэма рыначнай эканомікі ўсе віды дзейнасці ў складзе ценявой эканомікі адносіць таксама да вытворчай сферы і рэгіструе іх вынікі на адпаведных рахунках у сістэме нацыянальнага ўліку. Умовамі, якія вызначаюць дадзены метадалагічны падыход, з'яўляюцца выкарыстанне зыходных рэсурсаў для вытворчасці прадукцыі і паслуг. Пры гэтым узнікаюць цяжкасці з атрыманнем неабходнай інфармацыі, але яны не з'яўляюцца вызначальнымі.

Пры класіфікацыі відаў дзейнасці ценявой эканомікі сістэма нацыянальных рахункаў выяўляе:

1) вытворчасць забароненых да продажу тавараў і паслуг, напрыклад вырабы і кантрабанднае распаўсюджванне наркотыкаў;

2) віды дзейнасці, якія выконваюцца неўпаўнаважанымі на гэта асобамі, напрыклад урачамі без ліцэнзіі і на аказанне медыцынскіх паслуг;

3) дазволеныя законам віды дзейнасці, але ўтойваемыя вытворцамі з

мэтай: а) ухіленне ад выплаты падаткаў і адлічэнняў у фонд сацыяльнага страхавання; б) ухіленне ад захавання бяспекі і аховы навакольнага асяроддзя; в) адмовы ад вядзення ўліку і справаздачнасці і інш.

Віды дзейнасці, пералічаныя ў п. 1) і 2), адносяцца да незаконнай вытворчасці, а ў п. 3) — да скрытай падпольнай дзейнасці. Размежаванне супрацьзаконнай і падпольнай дзейнасці не адыгрывае тут якой-небудзь значнай ролі, паколькі тыя і другія аб'екты належаць да сферы вытворчасці.

Улік вытворчых відаў дзейнасці дае магчымасць вырашыць наступныя задачы:

атрымліваць больш поўныя даныя аб памерах вытворчасці і спажывання тавараў і паслуг;

дасягаць мінімізацыі памылак у фінансавых рахунках і плацёжным балансе краіны;

пазбягаць магчымых негатыўных вынікаў уліку, дзе мае месца супрацьзаконная выручка, якая можа выкарыстоўвацца зусім на законных падставах, або, наадварот, законна атрыманыя сродкі могуць выкарыстоўвацца ў незаконнай вытворчасці тавараў і паслуг.

Шэраг краін мае пэўныя поспехі ў зборы і распрацоўцы інфармацыі гэтага накірунку. Такая праблема стаіць і перад статыстычнымі службамі Рэспублікі Беларусь. Да гэтага часу яна наогул выпадала з поля зроку айчыннай статыстыкі. Ёсць меркаванне, не пазбаўленае навуковай аргументацыі, што для вырашэння гэтага пытання неабходна сфарміраваць здаровы імідж дзяржаўнай статыстыкі, даверлівыя адносіны да дзейнасці яе органаў. Не выключаецца пры гэтым таксама магчымасць стварэння альтэрнатыўнай статыстыкі, заснаванай на прыватнай уласнасці на статыстычную інфармацыю.

Падагульняючы вызначэнне межаў сферы вытворчай дзейнасці рыначнай эканомікі, неабходна зрабіць наступныя высновы:

па-першае, кожная дзейнасць, у працэсе якой ствараюцца тавары і паслугі, што могуць быць пастаўлены (нават неабавязкова, каб яны былі пастаўлены) другім эканамічным адзінкам, у сістэме рыначных адносін класіфіцыруецца як эканамічная дзейнасць;

па-другое, у рыначнай эканоміцы не ўлічваецца вытворчасць хатнімі гаспадаркамі паслуг для асабістага спажывання. У выніку межы вытворчай сферы дзейнасці пашыраюцца на велічыню гэтых паслуг.

Такім чынам, вытворчая сфера дзейнасці рыначнай эканомікі ахоплівае:

1) вытворчасць усіх відаў тавараў з улікам той іх часткі, якая пакідаецца вытворцамі для ўласных патрэб. Мяркуецца пры гэтым, што яна магла б быць прапанавана рынку;

2) вытворчасць усіх паслуг для пабочных спажыўцоў або паслуг, якія прызначаны для задавальнення патрэб грамадства ў цэлым. Пры гэтым да апошняй катэгорыі належаць паслугі ўрадавых устаноў (ад муніцыпальных органаў кіравання да цэнтральных), а таксама і некамерцыйных арганізацый. Кошт такіх паслуг не адыгрывае якой-небудзь значнай ролі, бо яны могуць прадастаўляцца наогул бясплатна або па цэнах ніжэй за рыначныя.

У адпаведнасці з азначанымі падыходамі на даны момант у рэспубліцы адпрацоўваецца метадалогія ацэнкі валавога выпуску тавараў і паслуг, прамежкавага спажывання і дабавачнай вартасці (валавога ўнутранага і нацыянальнага прадукту), вядуцца экперыментальныя падлікі гэтых і іншых паказчыкаў. Трэба думаць, што 1995 г. будзе годам паралельнага прымянення двух метадалогій. Пачынаючы з 1996 г. айчынная статыстыка поўнасцю пяройдзе на прынятыя ў сусветнай практыцы метадалагічныя стандарты.